Аб разьвіцьці мясной і кансэрвовай прамысловасьці

Усім партыйным, савецкім, гаспадарчым і прафэсыянальным арганізацыям

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня — XV
№ 267 (4173)
Чацьвер 1 кастрычніка
1931 г.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА.

Инв. Госкниг. 2805

РАШАЮЧЫ КВАРТАЛ РАШАЮЧАГА ГОДУ

Прамысловасьць БССР уступіла ў апошні квартал трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Вынікі за 8 месяцаў з усёй відавочнасьцю гавораць аб няўхільнай тэндэнцыі росту, уздыму і росквіту нашай прамысловасьці. Даволі паказаць, што валавая прадукцыя рэспубліканскай прамысловасьці, у параўнаньні з гэтым-жа пэрыядам 1930 г., складае 142,3 проц.

Гэтыя посьпехі дасягнуты на аснове жорсткай барацьбы за генэральную лінію партыі, за ажыцьцяўленьне вызначаных партыяй ТЭМПАЎ разьвіцьця, супроць мініміалісцкіх правапартыйнацкіх установак, супроць «лявацкіх» заскокаў і загібаў.

Перамогі нашай прамысловасьці нічо больш выпукла выдзяляюцца на фоне УСЕАГУЛЬНАГА ЭКАНАМІЧНАГА КРЫЗІСУ І ЎПАДКУ ВА ЎСІХ КАПІТАЛІСТЫЧНЫХ КРАІНАХ, [illegible] і ў нашых бліжэйшых суседзяў — [illegible] Польшчы, Румыніі [illegible].

Трэба падкрэсьліць, што [illegible] — апошні месяц, па якім [illegible] — зьвяўся [illegible] галін прамысловасьці БССР [illegible] скачок уверх на 22 проц. у [illegible] з ліпенем.

У жніўні паляпшэньне [illegible] МЭТАЛЯПРАМЫСЛОВАСЬЦІ [illegible] нуўшая росту супроць ліпеня на [illegible] проц. У прыватнасьці, машынабудаўніцтва вырасла на 28,4 проц., [illegible] 20,4 проц.

Значнае паляпшэньне [illegible] ецца па лініі здабычы ТОРФУ — [illegible] проц. супроць 29,9 проц. у ліпені. За [illegible] сезон нами здабыта торфу НА 76 ПРОЦ. БОЛЬШ МІНУЛАГА ГОДУ.

Жнівеньскі прырост прадукцыі [illegible] СКУРАНОЙ прамысловасьці [illegible] 19,8 проц. Плян за жнівень [illegible] на 104,2 проц.

ШВЕЙНАЯ прамысловасьць у жніўні дабілася прыросту прадукцыі на 14,8 процантаў.

Зрухі, дасягнутыя прамыслогасьцю за апошні час, неразлучна зьвязаны з ПЕРШЫМІ ПОСЬПЕХАМІ У ПЕРАБУДОВЕ ГАСПАДАРЧАГА КІРАЎНІЦТВА, на аснове рэалізацыі прамовы т. СТАЛІНА, якая дала найглыбейшы аналіз сучаснага этапу гаспадарчага будаўніцтва і паказала канкрэтныя задачы, якія выцякаюць з новай абстаноўкі. Рабочая клясa БССР адказала на ўказаньні правадыра партыі новай хваляй вытворчага энтузіязму, далейшым разьвіцьцём сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, упартай работай па аўладаньні тэхнікай вытворчасьці.

Посьпехі прамысловасьці БССР нясумненны. Яны яшчэ раз гавораць аб тым, што ў краіне дыктатуры пралетарыяту магчымы ТАКІЯ ВЫСОКІЯ тэмпы разьвіцьця, аб якіх ня можа нават і марыць капіталістычны сьвет.

Але, нікольні на праўменшаючы значэньня гэтых перамог, мы павінны з усёй вастратой паставіць пытаньне аб тым, што прамысловасьць сваіх плянаў ня выконвае. Даваць ацэнку работы прамысловасьці мы можам ТОЛЬКІ ў залежнасьці ад выкананьня ёю плянавых заданьняў. Так і толькі так можа стаяць пытаньне.

І з гэтага пункту погляду вынік васьмі месяцаў работы прамысловасьці прызнаць здавальняючымі НЕЛЬГА. Плян за гэты пэрыяд выкананы толькі на 85,7 проц. Яшчэ горш стаіць справа галіне ЯКАСНЫХ ПАКАЗАЛЬНІКАЎ.

У ланцугу прычын недавыкананьня плянаў трэба перш за ўсё паставіць НЕДАХОПЫ КІРАЎНІЦТВА ПРАМЫСЛОВАСЬЦЮ.

Усё больш узрастаючая тэхнічная зброеньсьць прамысловасьці, пашырэньне сырцовай базы, рост вытворчай актыўнасьці рабочых мас — усё гэта стварае поўную магчымасьць для выкананьня пляну.

Апартуністычныя перапевы аб «непасільных» тэмпах разьвіцьця ўшчэнт разбіваюцца работай перадавых прадпрыемстваў, ДАТЭРМІНОВА выконваючых свае заданьні («Бальшавік», фабрыка «Графінтэрн», фабрыка імя першага мая, фабрыка імя 8-га сакавіка, цэлы рад цэхаў іншых прадпрыемстваў і г. д.).

Пляны зусім рэальны. Шляхі да перамог, да поўнай рэалізацыі вытворчых праграм з усёй выразнасьцю акрэсьлены ў прамове таў. Сталіна на нарадзе гаспадарнікаў.

Між тым, у галіне перабудовы работы прамысловасьці, пачынаючы з нізавога звяна і канчаючы ВСНГБ, і зроблены толькі самыя першыя, пачатковыя кроікі. Але і яны прынесьлі ўжо свае станоўчыя вынікі.

Большасьцямі тэмпамі рэалізаваць указаньні правадыра партыі, — такая задача.

Арганізаваны набор рабочай сілы, барацьба з урэўніраўкай у зарплаце, далейшае паляпшэньне бытавых умоў рабочай клясы, барацьба з абязьлічкай, правільная арганізацыя працы, стварэньне кадраў тэхнічнай інтэлігенцыі з асяродзьдзя рабочай клясы, укараненьне ва ўсе зьвяньні прамысловасьці гаспадарчага разрахунку, канцэнтрацыя кіраўніцтва — вось коло неадкладных пытаньняў, над вырашэньнем якіх павінны няўхільна працаваць кожная партыйная і прафэсыянальная арганізацыя, кожны гаспадарнік, кожны рабочы.

Па ўсіх гэтых галінах нами зроблена яшчэ вельмі мала, недапушчальна мала. Упарадзе — вялізарная работа.

Чацьверты квартал павінен стаць ударным квартапам па перабудове работы прамысловасьці на аснове ўказаньняў тав. Сталіна. Гэты квартал павінен крынесьці РАШАЮЧЫЯ ПЕРАМОГІ на фронце барацьбы за прамфінплян, падрыхтаваць глебу для яшчэ БОЛЬШ ВЫСОКІХ ТЭМПАЎ ЗАКЛЮЧНАГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ.

Бязьлітасная барацьба на два фронты, ажыцьцяўленьне лёзунгу «Па-новаму працаваць, па-новаму кіраваць», дабіцьцё росту сацспаборніцтва і ўдарніцтва — забясьпечыць выкананьне гэтых задач.

Надыходзячыя тры месяцы — балы экзамэн прамысловасьці, месяцы ўпартай настойлівай барацьбы за ўдарныя тэмпы работы.

Рашаючы квартал рашаючага году завершым па-бальшавіцку!

НОВАЯ ПЕРАМОГА ПЯЦІГОДКІ

ПУСКАЮЦЦА Ў ХОД ХАРКАЎСКІ ТРАКТАРНЫ І АМО—

СУСЬВЕТНЫЯ ГІГАНТЫ ТРАКТАРНАГА І АЎТАМАБІЛЬНАГА БУДАЎНІЦТВА

Будаўнікі разьмяўюць аб першае

ЦК УсеКП(б)—тав. СТАЛІНУ, СНК СССР—тав. МОЛАТАВУ, ВСНГ СССР—тав. АРДЖАНІКІДЗЕ, ЦКПК(б)У — тав. КАСІОРУ, СНК УСР—тав. ЧУБАРУ, ВСНГ УСРР—тав. УХАНАВУ, гарпартком—тав. ЦЯРАБУ.

РАПАРТ

Выконваючы пастановы партыі і ўраду, рабочыя і інжынэрна-тэхнічны пэрсанал будаўніцтва Харкаўскага трактарнага заводу, бліскаючыся змагаючыся пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі за генэральную лінію партыі, на аснове шырокага разьвіцьця сацспаборніцтва і ўдарніцтва, перамаглі на адным з адказных участкаў сацыялістычнага будаўніцтва. Харкаўскі трактарны завод — адзін з гігантаў Савецкага Саюзу — [illegible] і змантаваны ў [illegible]. Завод да пуску гатоў. Задача партыі і ўраду аб пуску заводу [illegible] выкананая.

Начальнік будаўніцтва Харкаўскага трактарнага заводу
СЬЯГУН.
Сакратар парткома [illegible]

Урачыстасьці пуску ХТЗ

Сёньня, 1 кастрычніка, Саюз будзе сьвяткаваць пуск трактарнага заводу. На пуску будуць прысутнічаць члены ЦК партыі, ураду, рабочых сталіцы Украіны — Харкаву, шмат делегацый рабочых СССР і замежжа. На сьвята запрошаны 10.000 [illegible], 14.000 рабочых-[illegible] і г. д. [illegible] перадавых калгасаў і МТС па сваёй прыедуць 700 калгаснікаў. У 11 [illegible] раніцы 1 кастрычніка пачнецца [illegible] мітынг, на якім будуць выступаць члены ЦК партыі, ураду і вядучых прафэсыянальных арганізацый.

Харкаўскі трактарны завод назван імя т. Арджанікідзе

Усеукраінскі Цэнтральны Выканаўчы Камітэт пастанаўляе:

1. Задаволіць просьбу рабочай канферэнцыі Харкаўскага трактарнага заводу і раду іншых прадпрыемстваў аб прыданьні Харкаўскаму трактарнаму заводу імя тав. Арджанікідзе.

2. У сувязі з масьпіхоным сканчэньнем пабудовы і пускам Харкаўскага трактарнага заводу даручыць ВСНГ УССР прадставіць да ўзнагароды найлепш выдатных рабочых і інжынэрна-тэхнічных работнікаў гэтага пэрсаналу і адзначыць [illegible] прадпрыемства.

Харкаўскі Трактарны Гігант.

Харкаў, Трактрабуд

Ад імя рабочых, калгаснікаў і ўсіх працоўных Беларусі прэзыдыум ЦВК Савецкай Беларусі шчыра вітае рабочых, адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал Трактарабуду ў дзень пуску новага гіганту прамысловасьці. Ваша гераічная работа, бальшавіцкія тэмпы будаўніцтва забясьпечылі дакладнае выкананьне дырэктывы партыі і ўраду аб тэрмінах пуску Трактарабуду, служаць лепшым прыкладам барацьбы за генэральную лінію партыі, новым крокам наперад да перамогі сацыялізму і магутным ударам па ворагах дыктатуры пралетарыяту.

Трактары вашага заводу хутка зазуюць на калгасных палёх прымежнай Беларусі і, паскараючы сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі, будуць заклікаць працоўных суседніх краін на шлях сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі.

Старшыня ЦВК БССР А. Чарвякоў.

Ваша запрашэньне атрымаў, але за жаль ня маю магчымасьці прыняць асабісты ўдзел ва ўрачыстым пуску трактарнага заводу. Вітаю будаўнікоў трактаразаводу з блікучай перамогай на фронце індустрыялізацыі Савецкага Саюзу. Выказваю цьвёрдую ўпэўненасьць, што будаўнікі трактаразаводу і на іншых франтох гаспадарчага разьвіцьця будуць актыўнымі ўдзельнікамі сацыялістычнага будаўніцтва, змагарамі за генэральную лінію партыі, за сацыялізм.

Старшыня СНК БССР—ГАЛАДЗЕД.

АМО—завод будучыні

Мощна спаяны адзінай воляй да перамогі, ударны калектыў рабочых, інжынэраў і тэхнікаў маскоўскага заводу АМО сёньня, і кастрычніка, ва ўрачыстай абстаноўцы будзе сьвяткаваць пуск новага гіганту аўтамабілябудаўніцтва.

Упісаўшы ў кнігу самаадданай барацьбы за пяцігодку нямала гераічных старонак, амаўцы дакладна вытрымалі тэрміны будаўніцтва, даныя [illegible] Рашэньні, да рэканструкцыі, завод АМО выпускаў аўтагрузавікі ў паўтары тоны, цяпер ён прыступае да масавага выпуску магутнай шасьцідыляндравай 2½ тоннай машыны ў 66 карысных сіл.

Якасьць маркі машыны, якая выпускаецца АМО, на думцы тав. Леніна, вельмі высокая. Машыны адзначаюцца вялікай выносьлівасьцю і эканомічнасьцю.

Новая абстаноўка сацыялістычнага будаўніцтва, новыя ўзовы працы, якія забясьпечваюць больш паскораны рост матар'яльнага дабрабыту і культурнага ўзроўню рабочай масы, высоўваюць зараз на адно з першых месц задачу карэннай рэканструкцыі ўсёй харчовай прамысловасьці, і ў першую чаргу, задачу стварэньня магутнай мясной і кансэрвовай індустрыі. На аснове посьпехаў сацыялізму быстра павышаюцца патрэбы рабочай клясы ў прадуктах харчаваньня і тыя патрабаваньні, якія яна прад'яўляе да іх якасьці. Штогод у сацыялістычную прамысловасьць уцягваюцца мільёны новых рабочых, быстра павялічваецца насельніцтва гарадоў, узьнікаюць новыя гарады вакол шматлікіх індустрыяльных будоўляў, замацоўваюцца старыя бытавыя ўмовы рабочай сям'і, у шырокіх маштабах расьце грамадзкае харчаваньне і яшчэ шнарчэй патрэбнасьці ў ім. Для забясьпячэньня ў гэтых умовах снабжэньня працоўных прадуктамі харчаваньня і паляпшэньня рабочага забясьпячэньня, неадкладнай патрэбнасьцю зьяўляецца карэнная рэканструкцыя існуючых і будаўніцтва новых прадпрыемстваў мясной кансэрвовай прамысловасьці на аснове найлепшага злучэньня высокай тэхнікі навейшых мясакамбінатаў і кансэрвовых заводаў з сацыялістычна арганізаванай вакол іх сельска-гаспадарчай сыродвай базай.

Цэнтральны Камітэт і Савет Народных Камісараў адзначаюць рад посьпехаў за апошнія гады разьвіцьці прадпрыемстваў харчовай прамысловасьці, якія пераапрацоўваюць мясны, рыбны і плодагародны сыроі.

Пабудавана дзесяць новых мясакамбінатаў сярэдняга тыпу — у Омску, Вятцы, Краснадары, Армавіры, Палтаве, Ворпы, Фрунзе і г. д. з агульнай прапускной здольнасьці да 175 тыс. тон гатовых мясапрадукту у адну зьмену; пабудавана 17 бэконных фабрык — у Дарніцы, Марыўпалі Війску, Кремянчугу, Есінаве і інш. з агульнай прапускной здольнасьцю у адну зьмену да 200 тыс. тон гатовых мясных прадуктаў; пабудаваны 41 новы кансэрвовы завод, з іх 24 рыбакансэрвовых, 14 гародна-фруктовых, 3 мякансэрвовых з агульнай вытворчай магутнасьцю разам з рэканструяванымі мясакансэрвовымі заводамі да 1.200 мільёнаў 400 грамавых банак, у тым ліку 200 млн. мясных, 250 млн. рыбных і 750 млн. гародных і фруктовых, супроць выпрадукаванай кансэрвовай прамысловасьці ў 80 млн. банак.

Посьпехі гэтыя, адна зусім невыстарчальны з пункту погляду тых задач, якія паўстаюць у сувязі са зьменеай абстаноўкай. Нанава-пабудаваныя і рэканструяваныя прадпрыемствы мясной прамысловасьці ўладаюць пязначнай магутнасьцю, маюць сур'ёзныя тэхнічныя недахопы ў пераважнайбольшасьці гарадоў, у тым ліку і ў тых буйнейшых цэнтрах, як Масква, Ленінград, Сталінград і інш., мясалабесьпячэньне аснавана на архідатальных пабудаваных дваццаткі лет таму назад камунальных бойнях, якія не здавальняюць мінімальных тэхнічных і санітарных патрабаваньняў (з 175 буйных гарых бойняў, толькі 26 маюць вадапровод, пры большасьці бойняў няма рэк пераапрацоўваючых цэхаў — халадзільнага, утылізацыйнага, альбуміннага і інш.). Рад новых гарадоў — Магнітагорск, Бярэзьнікі і др. — вусім ня маюць мяса-пераапрацоўваючых прадпрыемстваў. Багацейшыя жывёлагадоўчыя раёны Усходу — Казахстан і Сі[illegible] — вымушаны з-за адсутнасьці мясакамбінатаў і нал[illegible] [illegible] скаціны [illegible] [illegible] дуктаў, нізкая якасьць і невыстарчальнае скарыстаньне каштоўных тэхнічных адыходаў мясной вытворчасьці.

У такіх-жа адсталых умовах старой прасольскай гаспадаркі робіцца пераапрацоўка больш паловы рыбы, якая здабываецца. Пры адсутнасьці выстарчальнай колькасьці халадзільнікаў і кансэрвовых заводаў на рыбных промыслах, пры адсутнасьці рэфрыжэратарнага флёту і вялікага недахвату ізатэрмічных вагонаў, звыш 60 проц. рыбы засольваецца, што значна пагаршае яе якасьць і пазьбаўляе страты рыбных прадуктаў. У вельмі невыстарчальнай ступені выкарыстоўваюцца адыходы рыбнай прамысловасьці з-за адсутнасьці неабходнай колькасьці ўтылізацыйных установак, якія могуць даць такія каштоўныя прадукты, як рыбныя тлушчы і рыбакосная кармавая мука. Асноўнай задачай сёньняшняга дня зьяўляецца рэарганізацыя старога рыбнага промыслу ў тэхнічна-узброенную рыбную прамысловасьць. Кансэрвовая прамысловасьць пераапрацоўвае самую пязначную частку прадукту і гародніны. Між тым без кансэрваваньня і іншых відаў пераапрацоўкі, без шырокага разгортваньня халадзільнікаў і сушыльнай справы значныя гародныя і фруктовыя багацьці акраін застануцца нявыкарыстанымі для паляпшэньня забясьпячэньня прамысловых цэнтраў.

Нізкі тэхнічны ўзровень пераапрацоўваючай прамысловасьці, побач з адсутваньнем сырцовай базы, складае адну з галоўных прычын затрудненьняў у справе забясьпячэньня рабочых мясам, рыбнымі прадуктамі і плодагародніной. Арганізацыя магутных жывёлагадоўчых саўгасаў, таварных жывёлагадоўчых ферм у калгасах, разьвіцьцё аграмалажнай пладовай і гароднай гаспадаркі, рэканструкцыя здабычы рыбы — адкрываюць шырокія магчымасьці для пязвычайнага росту сырцовай базы мясной і кансэрвовай індустрыі. Апіраючыся на сацыялістычна арганізаваную сырцовую базу, мясная і кансэрвовая прамысловасьць маюць магчымасьць шырокага выкарыстаньня ўсіх заваяваньняў сучаснай тэхнікі для пабудовы новага тыпу мясных і кансэрвовых прадпрыемстваў і тым самым поўнага здавальненьня ўзросшых патрабаваньняў рабочай клясы.

Нежыцьцёвасьць таго, як збожжавая праблема не магла быць вырашана на аснове дробнай, тэхнічна-адсталай сялянскай гаспадаркі, якраз такім-жа задача карэннага і рашучага палепшэньня забясьпячэньня працоўных мас ня можа быць вырашана на базе дробных тэхнічна-адсталых прадпрыемстваў харчовай прамысловасьці. Вось чаму хутчэйшае разгортваньне магутнай мясной і кансэрвовай прамысловасьці, якая апіраецца на навейшыя дасягненьні сусьветнай тэхнікі, становіцца адным з важнейшых звяньняў сацыялістычнай рэканструкцыі нашай краіны і павінна прыцягнуць да сябе такую-ж увагу з боку рабочай клясы, прафсаюзаў, партыі і ўсіх савецкіх арганізацый, якое спатэнцыраванае зараз на буйнейшых будоўлях. У гэтым клясе для вырашэньня задачы карэннага палепшэньня забясьпячэньня, шляхі палепшэньня прадукцыйнасьці працы, правільнай арганізацыі рабочай сілы і перамаганьня не дакучасьці. Неадаемна залежны ад стварэньня новай буйной харчовай індустрыі зьяўленьне такім-жа праяўленьнем анартэнізму, якім была недаацэнка ролі буйной с.-г. вытворчасьці на базе саўгасаў і калгасаў у справе вырашэньня збожжавай праблемы.

Рабочая клясa нашай краіны мае ўсе [illegible], каб і ў справе будаўніцтва харчовай прамысловасьці ня толькі дагнаць, [illegible] і ў найкарацейшы тэрмін апера[illegible] станаўляюць:

1. Ухваліць распрацаваны Наркамснабам СССР плян будаўніцтва на працягу 1931, 1932 і 1933 г. г. 57 новых мясапрамысловых камбінатаў з агульнай гадавой прапускной здольнасьцю ў адну зьмену да 1,5 млн. тон мясапрадукту.

У адпаведнасьці з гэтым пляном зацьвердзіць:

а) Будаўніцтва 8 буйных мясакамбінатаў з іх 3 у важнейшых рабочых цэнтрах — Маскве, Ленінградзе і Сьвярдлоўску і 5 — у асноўных вывазных раёнах мясной жывёлагадоўлі — Сямілалацінску, Орску, Пакроўску, Самары і на Паўночным Каўказе, з агульнай гадавой прапускной здольнасьцю ў адну зьмену ў 1.440 тысяч шт. буйной рагатай скаціны, 5.440 тысяч сьвіней, 1.260 тысяч авечак і з выпускам у адну зьмену 770 тысяч тон мясапрадукту, у тым ліку халадзільнага і марожанага мяса 270 тысяч тон, каўбасы і розных капчонасьцяй 280 тыс. тон, харчовага сала 85 тыс. тон і 180 млн. 400-грамавых банак кансэрваў.

б) Будаўніцтва 14 мясакамбінатаў сярэдняга тыпу, з іх 9 у буйных рабочых цэнтрах — Дняпрапятроўску, Запарожжы, Сталіне, Луганску, Ніжнім Ноўгарадзе, Іванаве-Вазьнясенску, Баку, Сталінградзе і ў раёне Кузбаса і 5 мясакамбінатаў у сырцовых раёнах — Верхнеўдзінску, Краснаярску, Уфе, Магілеве і ў раёне Сыр-Дар'і, з агульнай гадавой прапускной здольнасьцю іх у адну зьмену 900 тыс. шт. буйной рагатай скаціны, [illegible] і 1.800 тыс. сьвіней і 1.800 тыс. авечак, з выпускам у адну зьмену 400 тыс. тон мясапрадукту, у тым ліку марожанага і халоджанага мяса 180 тысяч тон, каўбасы і розных капчонасьцяй 160 тысяч тон., сала 50 тыс. тон і 37 млн. банак кансэрваў.

в) Будаўніцтва 35 дробных мясакамбінатаў па тыповых праектах, разьлічаных на абслугоўваньне патрэб такіх рабочых цэнтраў, як Іжэўск, Грозны, Бранск, Яраслаўль і інш. з агульнай прапускной здольнасьцю ў адну зьмену 1.100 тысяч шт. буйной рагатай скаціны, 3.200 тыс. сьвіней і 900 тысяч авечак з выпускам у адну зьмену 450 тыс. тон мясапрадукту, у тым ліку халоджанага і марожанага мяса 230 тыс. тон, каўбасы і розных капчонасьцяй 170 тысяч тон і сала 50 тысяч тон.

2. Пачаць будаўніцтва Маскоўскага, Ленінградскага, Сямілалацінскага і Орскага мясакамбінатаў, а таксама дзесяці дробных камбінатаў у 1931 годзе, са сканчэньнем іх не пазьней канца 1932 году. Пачатак будаўніцтва астатніх мясакамбінатаў адносьці да 1932 г. са сканчэньнем іх будаўніцтва да канца 1933 г.

3. Для забясьпячэньня мясакамбінатаў устойлівай сырцовай базай, у адпаведнасьці з пляном будаўніцтва новай мясной індустрыі зацьвердзіць наступны заказ мясной прамысловасьці сельскай гаспадарцы на разгортваньне саўгасаў мясной жывёлагадоўлі ў раёнах «тяготення» мясокамбінатаў і на здачу імі скаціны.

Тыс. гал.

Назва мясакамбінатаў	Здача скаціны Скотаводам у 1933 г.	Здача скаціны Скотаводам у 1935 г.	Здача скаціны Сьвіноводам у 1933 г.	Здача скаціны Сьвіноводам у 1935 г.	Здача скаціны Аўцаводам у 1933 г.	Здача скаціны Аўцаводам у 1935 г.
1. Маскоўскі	40	45	885	1.480	—	—
2. Ленінградскі	—	—	463	819	—	—
3. Сьвярдлоўскі	95	160	268	500	—	—
4. Сямілалацінскі	160	200	75	180	434	725
5. Орскі	120	180	118	200	189	297
6. Пакроўскі	130	240	607	776	76	128
7. Самарскі	105	160	679	1.142	204	312
8. Паўн. Каўк.	80	130	675	793	284	360
9. Дняпрапятроўскі	20	30	340	420	—	—
10. Запароскі	10	20	348	420	—	—
11. Сталінскі	15	21	170	210	—	—
12. Луганскі	15	25	170	210	—	—
13. Ніжэгародскі	—	—	178	501	—	—
14. Ів.-Вазьнес.	—	—	68	240	—	—
15. Вакінскі	15	30	—	—	38	61
16. Сталінградскі	45	80	107	137	148	242
17. Верхнеўдзінскі	30	80	70	150	203	369
18. Краснаярскі	70	100	147	300	141	180
19. Уфімскі	40	60	156	234	152	260
20. Магілеўскі	—	—	320	840	—	—
21. Сыр-Дар'інскі	48	67	—	—	—	—
22. З.-Сібірск. (у раёне Кузбаса)	25	40	75	175	—	—

4. Прапанаваць Наркамзему і Калгасцэнтру СССР сумесна з Наркамснабам СССР распрацаваць плян і неадкладна пачаць правядзеньне ўсіх неабходных мерапрыемстваў па адпаведным рэгортваньні мясной таварнай жывёлагадоўлі, сьвінагадоўлі і аўцаводзтва ў калгасах раёнаў «тяготення» мясакамбінатаў, а таксама выпрацаваць у адносінах якасьці, вагі і скорасьпеласьці стандарт мясной скаціны, якая пастаўляецца саўгасамі і таварнымі жывёлагадоўчымі формамі калгасаў, з тым, каб да 1935 году поўнасьцю ажыцьцявіць устаноўлены стандарт ва ўсіх саўгасах і ня менш як у палове калгасных таварных форм мясной жывёлагадоўлі.

6. Наркамснабу прадугледзець будаўніцтва ў 1933 г. у раёнах, [illegible] скотапрадукты, сеткі скотапрадукты баз [illegible] скаціны [illegible] артэлі [illegible] скаціны на [illegible] дзяных адыходах харчовай прамысловасьці, у [illegible] з планам разьвіцьця харчовай індустрыі, выходячы з неабходнасьці давесьці адкормачныя апэрацыі ў 1933 годзе да 1,5 млн. шт. буйной рагатай скаціны і ў сувязі з гэтым будаўніцтва ў 1932 годзе адкормачных валоўняў на 200 тысяч воламесц.

6. Прадугледзець у кантрольных лічбах 1932 г. неабходнае асыгнаваньне і матар'яльнае забясьпячэньне будаўніцтва мясных камбінатаў абсталяваньнем і будматар'ялам.

III.

7. Ухваліць прынятую Наркамснабам СССР праграму будаўніцтва на працягу 1931, 32 і 33 г. г. сямі кансэрвовых цэхаў пры новых мясакамбінатах, 36 рыбакансэрвовых берагавых і 23 плывучых заводаў, 36 гародніна пладовых [illegible] сушыльных пунктаў для пладоў і гародніны, а [illegible] у 1932 годзе ня менш 2.4 [illegible] сканчэньнем на [illegible] і [illegible] ў [illegible] сала.

	Мясныя	Рыбныя	Гародніны	Фруктов.	Тамата.	Усяго
1932 г.	230	400	350	85	185	1.250
1933 г.	450	600	730	200	420	2.400

8. Разьвіцьцё мясакансэрвовай вытворчасьці павінна быць пабудавана на:

а) поўнай загрузцы вытворчага апарату існуючых мясакансэрвовых заводаў;

б) выкарыстаньні рыбных, гародніных кансэрвовых заводаў у сэзон зацішша работ для вырабу мясных кансэрваў;

в) будаўніцтва ў складзе мясакамбінатаў спэцыяльных кансэрвовых цэхаў, з агульнай вытворчай магутнасьцю ў дадзе зьмены ў 435 млн. банак, якія (камбінаты) будуюцца ў жывёлагадоўчых раёнах (Сямілалацінскі, Самарскі, Пакроўскі і Орскі — па 90 млн. банак, Сібірскі, Сыр-Дар'інскі, Верхнеўдзінскі — па 25 млн. банак).

9. Разьвіцьцё рыбакансэрвовай вытворчасьці павінна быць сканцэнтравана ў раёнах, значная частка ўлову якіх ня можа быць вывезена ў спажываючыя цэнтры ў сьвежым або марожаным выглядзе, а таксама ў раёны, якія да гатага часу былі невыстарчальна ахоплены прамысловай пераапрацоўкай, дзе выкарыстаньне рыбных сырцовых рэсурсаў стаіць яшчэ на якасна нізкім узроўні. У адпаведнасьці з гэтым будаўніцтва новых спэцыяльных рыбакансэрвовых прадпрыемстваў у асноўным павінна быць накіравана на асваеньне раёнаў Касьвійскага басэйну, Цілакіянскага басэйну, Паўночнага і Арала-Вазхаскага раёнаў. У гэтых мэтах зацьвердзіць будаўніцтва 59 берагавых і плывучых кансэрвовых заводаў з агульнай вытворчай магутнасьцю ў дадзе зьмены ў 327 млн. банак з наступным разьмеркаваньнем іх па басэйнах:

а) У Касьвійскім басэйне — 8 берагавых рыбакансэрвовых заводаў (у Гур'еву, Макгішлаку, Жылой Касе, Дэнгісе, у раёне Белінскага банку, Лагане, Джылліце, Гасан-Куле) і 16 плывучых заводаў;

б) у Ціхаакіянскім басэйне — 14 кансэрвовых заводаў — на Амуры, Прымор'і і Камчатцы, і 7 плывучых крабакансэрвовых заводаў;

в) у Паўночным краі 5 заводаў — на Аральскім моры 3, на возеры Валхаш — 2, на Усходняй Сібіры і Якуціі — 4 заводы.

10. У раёнах, з якіх частка рыбы можа быць дастаўлена ў цэнтры ў марожаным выглядзе, кансэрвовыя заводы павінны быць камбінаваны з халадзільнікамі для замарожваньня рыбы, цэхамі на вырабе рыбнага філе і спэцыяльнымі цэхамі па утылізацыі адыходаў рыбнай вытворчасьці.

11. Весьці будаўніцтва спэцыяльных гародніна-фруктовых кансэрвовых прадпрыемстваў з такім разьлікам, каб якасьць плодагародніных масыў раёнаў, аддаленых ад прамысловых цэнтраў. У 1932 і 1933 гадох пабудаваць 36 гародніна-фруктовых кансэрвовых заводаў з агульнай вытворчай магутнасьцю да 1.200 млн. банак, з іх 6 — на Ніжняй Волзе, 2 — на Сярэдняй Волзе, 7 — на Украіне, 10 — на Паўночным Каўказе, 3 — у Закаўказьві.

12. У мэтах рацыяналізацыі і канцэнтрацыі вытворства бляшана-банчнай тары разгарнуць будаўніцтва ў 1932 і 1933 г. г. пяці раённых бляшана-тарных заводаў для абслугоўваньня кансэрвовых заводаў, якія стаяць [illegible] да іх.

IV.

13. Разгортваньне мясной і кансэрвовай [illegible] ства мясапрамысловага і кансэрвовага абсталяваньня найбольш дасканалага ўзору.

ЦК і Саўнарком прапануюць ВСНГ СССР згуртаваць указаную вытворчасьць у спэцыяльным усесаюзным аб'яднаньні па харчовым машынабудаўніцтве, з неадкладнай перадачай яму раду машынабудаўнічых заводаў і арганізацыяй у складзе гэтага аб'яднаньня (у месячны тэрмін) канструктарскага бюро па спэцыяльным мясакансэрвовым машынабудаўніцтве. Сьпіс заводаў, якія перадаюцца, а таксама плян іх спэцыялізацыі і пашырэньня прадставіць не пазьней 15 кастрычніка на зацьвярджэньне СНА.

Пры зацьвярджэньні праграмы мясапрамысловага і кансэрвовага машынабудаўніцтва СНА прадугледзіць, пачынаючы з канца 1932 году, поўнае задавальненьне мясакамбінатаў і кансэрвовых заводаў як спэцыяльным тэхналягічным абсталяваньнем (канвэрныя сталы, скробмашыны, электрычныя піны, экстракцыйныя і утылізацыйныя ўстаноўкі, аўтаклавы, закатчыя аўтаматы, рэзальныя, праціральныя і ачышчальныя агрэгаты і г. д.) так і агульна-заводзкім абсталяваньнем (сілавыя ўстаноўкі, катлы, помпы, вэнтылятары і т. д.).

14. Для забясьпячэньня сваячасовага пуску першай групы мясакамбінатаў, якія будуюцца ў Маскве, Ленінградзе, Сямілалацінску і Орску, ЦК і Саўнарком лічаць неабходным:

а) абавязаць ВСНГ СССР разгарнуць вытворчасьць абсталяваньня для іх з такім разьлікам, каб для маскоўскага і сямілалацінскага камбінатаў здаць усё абсталяваньне не пазьней другога кварталу, для Ленінградзкага і Орскага — не пазьней трэцяга кварталу 1932 году;

б) прапанаваць СНА пры зацьвярджэньні пляну цёплаэлектразабясьпячэньня забясьпечыць патрэбу мясапрамысловых камбінатаў у электраэнэргіі і пары, прадугледзеўшы, у прыватнасьці, сваячасовае сканчэньне і цёплацэнтралі ў Маскве і раённай цёплаэлектрастанцыі ў Сямілалацінску.

в) Усклаьці на Маскоўскі і Ленінградзкі саветы адказнасьць за сваячасовую падачу на тэрыторыю адпаведных камбінатаў вады, якія будуюцца, прадастаўленьне жыльлёвых памяшканьняў для рабочых і пабудову каналізацыі.

15. У адпаведнасьці з агульным пляном будаўніцтва мясной індустрыі, ЦК і Саўнарком лічаць неабходным правядзеньне карэннай рэканструкцыі халадзільнай і хладатранспартнай гаспадаркі і прапануюць Савету Працы і Абароны ў месячны тэрмін разгледзець і зацьвердзіць:

а) Праграму будаўніцтва халадзільнікаў (базісных [illegible] аркавальных і пры магазынах [illegible] фабрыках-кухнях), і [illegible] заводаў на выпрэ[illegible] плян будаўніцтва [illegible] рэфрыжэратарных [illegible] спэцыяльных ваго[illegible] ёлы.

[illegible] мясной прамысловасьці [illegible] аўтамабільным [illegible] вывозу скаціны да масавага [illegible] і развозкі гатовай [illegible] мерчаральнай сеткі.

[illegible] лічаньня бесьперабойнасьці [illegible] і кансэрвовай прамысловасьці [illegible] прыкладзь неабходнымі [illegible]

а) павялічыць выраб белай бляхі з 1932 годзе да 130 тыс. тон і ў 1933 г. [illegible] дзе — да 266 тыс. тон.;

б) шырока ўжываць у кансэрвовай вытворчасьці шклянную тару, выходячы з разьліку выпуску ня менш [illegible] млн. банак кансэрваў у шкляной тары ў 1932 годзе і 800 млн. банак — [illegible] 1933 годзе, для чаго ВСНГ СССР [illegible] ўзгадненьні з Наркамснабам набудаваць на працягу 1932 году ў раёне знаходжаньня прадпрыемстваў кансэрвовай прамысловасьці чатыры заводы па мэханізаванай выпрадукцыі шклянной тары, а Саўвакансэрву пабудаваць самастойна рад заводаў па выпрадукцыі шклянной тары.

V

17. Рэзультатам нізкага тэхнічнага ўзроўню існуючых прадпрыемстваў мясной і кансэрвовай прамысловасьці і сэзоннасьці гэтых вытворчасьцяў зьявляецца крайні недахват сярэдняга і кіруючага тэхнічнага пэрсаналу і пастаянных кваліфікаваных рабочых кадраў.

У мэтах забясьпячэнь

БАРАЦЬБА ЗА ПРАМФІНПЛЯН

ГАЛУПЕНЬНЕ НА ЗБОРАЧНЫ ЦЭХ „ЧЫРВОНАГА МЭТАЛІСТА“

ПРОЗЬВІШЧЫ РЫЖЫНСКАГА, ЛАБАСЬЦЕНКІ і КАПУСЬЦЯНСКАГА ПАВІННА ВЕДАЦЬ УСЯ БССР

ПРАЦАВАЦЬ ТАК, ЯК ПРАЦУЮЦЬ РЫЖЫНСКІ, ЛАБАСЬЦЕНКА І КАПУСЬЦЯНСКІ

ВІЦЕБСК (Наш кар.). Завод «ЧЫРВОНЫ МЭТАЛІСТ» паказвае сапраўдныя бальшавіцкія тэмпы па выпуску бульбакапалак. Згодна плану, завод павінен штодзенна выпускаць 24 бульбакапалкі. Рабочыя і інжынерна-тэхнічны персанал заводу далі сустрэчную пічбу ў 40 бульбакапалак, за якую ўпарта змагаліся і выконвалі.

Цяпер завод пераключаецца на штодзенны выпуск 45 бульбакапалак. Але на заводзе і ў прыватнасьці ў зборачным цэху ёсьць інжэ-ўдарнікі, якія перашкаджаюць выкананьню прамфінпляну. Гэта: КЛЯЦКО, САРОКІН, ШЫДЛОЎСКІ і інш. Яны 10-га і 11-га верасьня зрабілі прагул і ён вынік, у гэтыя дні выпушчана толькі па 32 бульбакапалкі. Гэты ўчынак інжэўдорнікаў-прагульшчыкаў выклікаў абурэньне ўсяго заводу. Зборачны ЦЭХ АДКАЗАЎ ПРАГУЛЬШЧЫКАМ ЯШЧЭ БОЛЬШЫМ ПАВЫШЭНЬНЕМ ТЭМПАЎ РАБОТЫ. ТРОЕ ЛЕПШЫХ УДАРНІКАЎ: РЫЖЫНСКІ, ЛАБАСЬЦЕНКА І КАПУСЬЦЯНСКІ, КАБ НАЦЯГНУЦЬ СТРАТУ 7 І 8-ГА ВЕРАСЬНЯ ЗАСТАЛІСЯ ПРАЦАВАЦЬ ЗВЫШТЭРМІНОВА.

12-га ВЕРАСЬНЯ БЫЛО ВЫПУШЧАНА 57 БУЛЬБАКАПАЛАК.

На другі дзень вытворчая праграма па выпуску бульбакапалак ВЫКАНАНА НА 115 проц. (СУПРОЦЬ СУСТРЭЧНАГА) — ВЫПУШЧАНА 46 БУЛЬБАКАПАЛАК. Такарны і інш. падрыхтоўчыя цэхі за апошні час значна палепшылі сваю работу.

А. З.

Швэйная прамысловасьць набірае тэмпы

Скарнякная фабрыка «1-е мая» 22-га верасьня закончыла выкананьне пазалічанага квартальнага пляну. Шпейаб'яканьне вызначыла ў распаряджэньне фабрыкі 1.000 рублёў для прэміяваньня адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу і лепшых ударнікаў.

***

Фабрыка імя Валадарскага, якая мела раней вялікі прарыў, зараз ліквідавала яго. Пры дапамозе буксіру фабрыкі «Прафінтэрн» праграма за 4-ю пяцідзёўку верасьня выканана на 125 проц. Перакраты ўвесь верасьнёўскі прарыў. На 20-е верасьня плян выканан на 101 проц.

Праграма 3-га кварталу выканана датэрмінова

ВІЦЕБСК (ПА ТЭЛЕГРАФУ) ЦЭХ ПАЎПАЛІТО ШВЭЙНАЙ ФАБРЫКІ «ПРАФІНТЭРН» ВЫКАНАЎ ДАТЭРМІНОВА ПРАГРАМУ 3-ГА КВАРТАЛУ 27 ВЕРАСЬНЯ НОЧУ. ПЛЯН ЗА 20 ДЗЁН ВЕРАСЬНЯ ВЫКАНАН НА 114 ПРОЦ.



На індустрыяльнай будоўлі. Днепрабуд.

Фабрыка „Пралетарская перамога“ ня выходзіць з паласы прарываў

Н. Барысаў. Прастоі на фабрыцы «Пралетарская перамога» ўвайшлі ў сыстэму. У большасці прастоі выклікаюцца недавыкананнем дзённых праграм выпрацоўкі асобымі цэхамі, што вядзе да зрыву канвэеру работ.

Па віне шчапальнага цэху, які не дае шчапы, шыберні гільзы ў каробачным цэху кожны дзень маюць 15—20 гадзін прастою. Шчапальны цэх, па віне чурачнага, які не да належнага асартымэнту чурак, прастоўвае таксама па 15—20 гадзін. Прастоі і зрыў канвэеру арабліся храпічнай заробай.

Адміністрацыя як фабрыкі, так і асабліва цэхаў не маглі перабудаваць свайго кіраўніцтва якое-б адказвала новым умовам працы.

Толькі за жнівень месяц было 6232 чалавекагадзін прастою. Прамфінплян па фабрыцы выкананы толькі на 76,5%. Прамова тав. Сталіна не рэалізавана. Асобныя прыклады ўдарнай працы рабочых адміністрацыя падтрымаць недастаткова. Творчы энтузіязм рабочых на выкарыстаны для ліквідацыі прарываў, для ўдарнага баявога выкананьня вытворчых праграм. (Бепт).



На індустрыяльнай будоўлі Макеўскі Металюргічны гігант.

АПЭРАЦЫЙНАЯ ЗВОДКА

АБ ВЫКАНАНЬНІ ПРАМФІНПЛЯНУ ПРАДПРЫЕМСТВАМІ ВСНГБ ЗА 20 ДЗЁН ВЕРАСЬНЯ 1931 Г.

Назва прадпрыемстваў	Процэнты выкананьня месячнага пляну
МЭТАЛЯАПРАЦОЎЧАЯ	40,4
1. «Чырвоны Мэталіст»	43,2
2. «Гомсельмаш»	53,3
3. «Чырвоны Кастрычнік»	55,6
4. «Інтэрнацыянал»	41,8
5. «Ударнік»	24,5
6. «Іголкавая»	38,1
7. Акупярная	42,5
8. «Пралетары»	29,8
9. Імя Барашылава	36,7
10. «Камунар»	21,5
11. «Рухавік рэвалюцыі»	60,0
12. «Чырвоны адраджэнец»	42,5
13. «Камінтэрн»	60,2
14. Імя Сталіна	22,0
ЦАГЕЛЬНІ	21,2
№ 1	10,1
2	27,0
3	25,2
4	37,7
5	47,0
6	21,1
7	23,6
8.	16,9
9.	23,5
10.	44,3
КАФЭЛЬНЫ ЗАВОД	62,7
ШКЛЯНАЯ	42,5
«Пралетары»	66,4
«Ільліч»	41,6
«Ноўка»	38,7
Імя Домбаля	52,9
«Кастрычнік»	31,0
ГАРБАРНАЯ	63,2
«Бальшавік»	74,5
Віцебская гарбарня	59,2
Магілёўская гарбарня	55,7
Гомельская гарбарня	58,9
Сыр. цэх. рым. Ф-кі	65,8
Рыжарная	54,0
ХІМІЧНАЯ	58,3
Клімаэіч. асф. завод	33,8
«Чыр. хэмік»	62,8
ГАЛЯНТАРЭЙНАЯ	60,0
ФАНЭРНАЯ	56,1
«Дняпро»	62,6
«Вэзувій»	57,9
«Бярэзіна»	42,9
АБУТКОВАЯ	45,0
Менская	37,7
Віцебская	44,7
Гомельская	52,7
Ф. З. В.	66,6

Назва прадпрыемстваў	Процэнты выкананьня месячнага пляну
ТЭКСТЫЛЬНАЯ	55,0
Ільнапрадзільная «Дзьвіна»	46,7
Ільнопрадзільная імя К. Маркса	52,7
«Дняпроўская ман-ра»	36,3
Якаўлев. суконная	65,2
Панчошна-трыкатажная	61,3
ЗАПАЛКАВАЯ	50,4
«Вэзувій»	47,1
«Дняпро» і «Х Кастрычнік»	55,7
«Бярэзіна»	37,4
«Перамога»	51,6
	47,8*)
ШВЭЙНАЯ	95,2*)
«Кастрычнік»	100,7
«Сьцяг індустрыялізацыі»	76,9
«Прафінтэрн»	113,2
«Камінтэрн»	96,8
Імя Дзяржынскага	101,4*)
Імя Валадарскага	100,6
	55,0

* Проц. выкананьня 2-хдзёкадн. пляну ў працагадзінах.

На індустрыяльнай будоўлі Макеўскі Мэталюргічны гігант.

УЗМАЦНІМ СУВЯЗЬ З ЧЫРВОНАЙ АРМІЯЙ

Адначасова з манэўрамі РСЧА ў Менску праводзіліся манэўры СПА. Многія прадпрыемствы разам з манэўрамі СПА праводзілі вытворчыя манэўры на сваіх заводах, заключылі сацыялістычныя дагавары з падшэфнымі вайсковымі часьцямі на лепшае правядзеньне манэўраў, на ліквідацыю прагулаў, на выкананьне прамфінпляну. Перадавыя прадпрыемствы (завод «Бальшавік», кушнерная фабрыка, фабрыка 8 сакавіка і інш.) паказалі чорныя прыклады працы—датэрмінова выканалі прамфінплян трэцяга квартылу трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Блестучыя прыклады і вялікія посьпехі ў баявой падрыхтоўцы паказалі часьці Чырвонай арміі за час манэўраў.

Зараз трэба абмяркаваць вопытам работы лепшых прадпрыемстваў і падвесьці вынікі баявой падрыхтоўкі часьцей Чырвонай арміі. З гэтай мэтай гарпрафсавет, дом Чырвонай арміі і гарсавет Асоавіяхіму арганізуюць сёньня ў 7 гадз. вечара ў памяшканні цырку вечар змычкі Чырвонай арміі з працоўнымі Менску. На гэтым вечары прадстаўнікі Чырвонай арміі далажаць працоўным Менску аб посьпехах баявой вучобы, адначасова прадпрыемствы Менску даложаць у сваіх рапартах аб дасягненьнях у галіне выкананьня прамфінпляну.

Ф. С.

Арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў— цэнтральная задача сельпарткомаў і вясковых ячэек

ВЫКАРАНЯЦЬ ПРАВААПАРТУНІСТЧНУЮ ПРАКТЫКУ І „ЛЯВАЦКІЯ“ ПЕРАГІБЫ, МАЦНЕЙ БІЦЬ ПА КУЛАЦТВЕ, ЯКОЕ ІМКНЕЦЦА ПАДАРВАЦЬ КАЛГАСЫ ЗНУТРЫ

Мацней агонь па правых і „левых“ апартуністах

Пасьлядоўнае правядзеньне ў жыцьцё ленінскіх прынцыпаў калгаснага будаўніцтва на аснове ажыцьцяўленьня пастаноў 16-га зьезду партыі, ушартая барацьба з праваапартуністычнымі скажэньнямі лініі партыі і з «левымі» загібамі забясьпечылі посьпяховае правядзеньне ў жыцьцё праграмы калектывізацыі, устаноўленай ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б для трэцяга рашаючага году пяцігодкі. На 20 верасьня калгасамі ахоплена амаль палова (48,9 проц.) бядняцка-серадняцкіх гаспадарак БССР. Гэтыя посьпехі—руйнуючы ўдар па апартуністах, ныціках і малаверах.

Аднак было-б памылкова і шкодна лічыць, што апартуністкім канчаткова разгромлен, што барацьба з ім традыцыі сваю актуальнасьць. Пастановы ЦК КП(б)Б аб Лельчыцкім, Церахаўскім, Асьвейскім і Бягомльскім раёнах з усёй выразнасьцю сьведчаць аб тым, што ў гэтых раёнах у апошні час мелі месца факты яўнага скажэньня лініі партыі. Праваапартуністычная практыка і стаўка на самацёк у рабоце і кіраўніцтве пасобных вячэек Церахаўскага і Асьвейскага раёнаў прывялі да значнага недавыкананьня ў гэтых раёнах весьнавых пасеўных плянаў (Церахаўскі—на 22 проц., Асьвейскі—16 проц.)і буйных прарываў і псарболяў ва ўборцы ўраджаю і г. д.

Кулацка-заможныя гаспадаркі злачынна сабатавалі выкананьне даведзеных ім цьвёрдых заданьняў. Між тым РК КП(б)Б Церахаўскага і Асьвейскага раёнаў не прынялі ніякіх захадаў, каб прыцягнуць да адказнасьці кулацка-заможныя элементы і тых, хто патураў іх сабатаванью.

Зараз кулак пэнтр цяжару свайго супраціўленьня пераможнаму наступленьню калектывізацыі перанёс у калгасы. Дэзарганізацыяй калгаснай вытворчасьці кулак імкнецца разбурыць калектыўную гаспадарку знутры, выклікаць нелюбоў гаспадарку знутры, выклікаць недавер'е в боку бяднацка-серадняцкіх мас вёскі да калгаснага будаўніцтва, аслабіць тэмпы калектывізацыі і гэтым самым адтэрмінаваць сваю нямінучую памыгібель. Між тым пытаньні арганізацыйна-гаспадарчага замацаваньня калгасаў, у радзе месц выплылі з-пад увагі некаторых асобных партарганізацый. На 12 сельсаветах Церахаўскага раёну, дзе толькі 11 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак ахоплена калгасамі, не надаючы ўвагі арганізацыйнай дрэнна пастаўлена арганізавычай працы ў калгасах як «ніжэйшы» ня была абкладзена ў індывідуальным парадку. Гэта невыпадкова. У тым-жа раёне раённы нарсудзьдзя адкрыта выкараняць кулакоў, якія ўчынялі гэрабаранне кулакоў, якія ўчынялі контрыстычныя акты ў адносінах да калгаснага актыву. Перарастаўскі сельсавет пад уплывам кулакоў вынес пастанову аб тым, што ў гэтым сельсавеце няма для калектывізацыі няма, а таму пастанавілі калектывізацыю адкласьці.

Замест таго, каб окарыстаць мацнейшых сродкаў калектывізацыі вёскі Церахаўскім і Асьвейскім раёнах МТС

Значная частка сельпарткомаў Полацкага раёну яшчэ да гэтага часу не перабудавала сваёй работы па-новаму, не паставіла ў цэнтр сваёй увагі работы па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў. Так, напрыклад, партарганізацыі Замшанскага, Наўліцкага, Закарскага, Вароніцкага, Астроўшчынскага і іншых сельсаветаў раёну зусім не аддаюць увагі барацьбе з ураўніліўкай і ўкараненьню зьдзельшчыны ў работу калгасаў.

Гэтымі сельпарткомамі яшчэ да гэтага часу не распрацавана і не папулярызавана сярод калгасьнікаў пастанова НКЗ і Калгасцэнтру аб парадку разміркаваньня ўраджаю. У радзе калгасаў пад уплывам кулацкай агітацыі прадуктовыя авансы выдаюцца па ...шах, а не ў залежнасьці ад выпрацаваных працадзён.

Чатырохмесячная практыка работы банку ў новых умовах паказвае, што ў галіне заключэньня дагавораў мы дабіліся рэальных посьпехаў, прымусіў гаспадарку цьвёрда перайсьці на дагаворныя адносіны. Аднак, тая-ж практыка выявіла вялізарныя недахопы, якія мы маем у гэтай справе.

ГАЛОЎНЫ І АСНОЎНЫ НЕДАХОП—гэта ў большасьці выпадкаў ФАРМАЛЬНАСЬЦЬ дагавораў. Дагавор яшчэ ня стаў тым дакумантам, які на самой справе кантраляваў-бы выканальнае ўзаемных абавязацельстваў бакоў, між тым, як іменна праз такі кантроль справа гаспадарчага разрахунку, пасьлядоўнае выкананьне прамысловага і грамадзкага фінпляну могуць атрымаць сваё сапраўднае разьвіцьцё. Сур'ёзных адносін да дагавораў з боку многіх гаспадарчых органаў мы яшчэ да гэтых пор не наглядаем. Дагавор пакуль што ў радзе выпадкаў зьяўляецца толькі дакумантам для атрыманьня крэдытаў у банку, але не дакумантам для забясьпячэньня выкананьня сваіх пляннаў. Характэрна, што арбітражныя камісіі, спэцыяльна створаныя ўрадам для разбору канфліктаў, зьвязаных з выкананьнем дагавораў, разгарнулі сваю работу ўсім невыстарчальна, прычым гэта становішча не выцякае з здавальняючага выкананьня дагавораў. Наадварот, выкананьне абавязацельстваў зафіксаваных у дагаворах, працякае ў вышэйшай ступені ненармальна. Скрозь і ўсюды асноўныя ўмовы дагавораў парушаюцца. І хаця амаль ва ўсіх дагаворах фіксуецца дакладна, пад якія рэпрэсіі падпадае бок, што парушае дагавор (уплата пені, пяўстойкі і інш.), але гаспадарнікі гэтых рэпрэсій амаль ня ўжываюць. Гэтым і тлумачыцца, што дагавор замест бальвога вагара для ўзаемнага кантролю, ператвараецца ў фармальную паперку, патрэбную гаспадарчаму органу толькі для прадстаўленьня ў банк на прадмет атрыманьня крэдыту.

Неабходна самая ўпартая барацьба супроць такіх адносін да дагавораў і супроць іх парушыцеляй.

Папраўкі ў крэдытнай рэформе, уведзеныя з 1-га мая, меркавалі такі парадак крэдытаваньня, пры якім ня было-б месца для пакрыцьця страт і прарываў у тых гаспадарчых органах, якія дрэнна працуюць.

І ў гэтай галіне мы дабіліся ПЭЎНЫХ СТАНОЎЧЫХ ВЫНІКАЎ. Калі да 1 мая залазычанасьць гаспадарчых органаў банку заўсёды з месяца ў месяц пераходзіла за рамкі адкрытых крэдытаў з-за яшчэ існуючага аўтаматызму ў аплаце рахункаў, дык з увядзеньнем папраўак становішча рэзка МЯНЯЕЦЦА. Як ідзе выкарыстаньне банкаўскіх крэдытаў у БССР за прашоўшыя 4 месяцы можна бачыць з наступнага.

Калі залазычанасьць на 1 красавіка ў адносінах да ліміту складала 118 проц., дык на 1 мая ступень выкарыстаньня ліміту складала 100 проц. *) на 1 чэрвеня—85 проц., на 1 ліпеня—90 проц., на 1 жніўня—76 проц. і на 1 верасьня—79 проц.

Калі раней пры аўтаматызме невыкананьне гаспадарчымі органамі сваіх пляннаў амаль не адбівалася на тэмпе крэдытаў, паколькі страты і прарывы пакрываліся за кошт банкаўскіх сродкаў, дык з увядзеньнем папраўак гэта стала МЕНШ МАГЧЫМЫМ.

Аднак, і цяпер з прычыны таго, што рад гаспадарчых органаў не ўладае сваімі ўласнымі аборотнымі сродкамі і мінімальнага задавальненьня сваіх патрэб, якія выцякаюць з пляну выгворчасьці ці звароту тавараў і ўвесь рост гэтых патрэб да гэтага часу поўнасьцю пакрываецца яшчэ банкам, пытаньне аб захаванасьці банкаўскіх сродкаў, аб немагчымасьці выкарыстаньня іх на пакрыцьцё прарываў застаецца яшчэ нявырашаным. І на самой справе, па некаторых арганізацыях (торфаб'яднаньне, Лесбел і г. д.) мы наглядаем, што ступень выканальнасьці пляну значна адстае ад фактычнага выкарыстаньня адпушчаных крэдытаў, прычым ва ўсіх выпадках гэты разрыў паказвае, што адпушчаныя банкам лішнія сродкі ішлі фактычна на пакрыцьцё прарываў у гаспадарцы.

Закон ад 23 ліпеня заклікае ПАКЛАСЬЦІ КАНЕЦ такому становішчу. Гаспадарчыя органы атрымліваюць улас ныя аборотныя сродкі, бакі крэдытуе поўныя працэсы (сэзонныя накапленьні таварных каштоўнасьцяй, сумы ў дарозе і г. д.). Такім чынам крэдытаваньне гаспадаркі праводзіцца ў такіх межах, якія павінны поўнасьцю забясьпечыць ня толькі захаванасьць адпушчаных банкам сродкаў, але і іх аборотнасьць у дакладна ўстаноўлены тэрмін. Гэты парадак ускладае на нашых гаспадарнікаў сур'ёзную адказнасьць за фінансавае становішча сваёй гаспадаркі.

Цяпер ужо НЕЛЬГА БУДЗЕ свае прарывы і страты пакрываць за кошт сродкаў Дзяржбанку, бо апошні будзе крэдытаваць поўную мэту, зьвязаную з фактычнай выгворчасьцю і рухам тавараў каштоўнасьцяй. Цяпер страты і прарывы павінны будуць ісьці за кошт уласных аборотных сродкаў самога гаспадарчага органу.

Побач з гэтым гаспадарчыя органы атрымліваюць значна БОЛЬШ ПРАВОЎ у галіне мабілізаваньня сваіх сродкаў і накапленьняў. Застаўленьне накапленьняў у распараджэньні саміх гаспадарчых органаў стварае магутны стымул да стварэньня гэтых накапленьняў. Тая акалічнасьць, што раней амаль усе накапленьні браліся ад гаспадарчага органу, прыводзіла да таго, што ў апошняга ня было зацікаўленасьці ні ў накапленьнях, ні наогул у фінансавых рэзультатах сваёй работы. На гое цяпер, калі добрая работа СТВАРАЕ РЭАЛЬНУЮ БАЗУ для далейшага пасьляховага разьвіцьця тэй справы, на якую пастаўлен даны гаспадарнік.

Можна сьцьвярджаць, што сапраўдным бізуном для справы гаспадарчага разрахунку зьяўляецца надзвычайная алгасьласьць у галіне ўліку і справаздачнасьці. У гэтай галіне мы вельмі адсталі. Вельмі частае зьявішча, калі гаспадарчы орган ня мае свайго балянсу на працяту 6,8,10 і больш месяцаў. Новы парадак крэдытаваньня патрэбуе рашучую барацьбу за своечасовую і добраякасную справаздачнасьць. АДСУТНАСЬЦЬ БАЛЯНСАЎ на апошні месяц будзе азначаць для гаспадарчага органу ПАЗБАВЛЕНЬНЕ КРЭДЫТАЎ у Дзяржбанку.

Самыя жорсткія патрабаваньні ў гэта станоўчых рэзультатаў, бо трэба, нада станоўчых рэзультатаў, бо трэба, нарэшце, усвоіць сабе, што няма гаспадарчага разрахунку без своечасовай справаздачнасьці.

У заключэньне неабходна ўспомніць яшчэ аб адным важнейшым, амаль незакранутым у сэнсе арганізацыі фінансавай гаспадаркі, вучастку.

Гутарка ідзе аб КАЛГАСАХ

№ 267 (4173)
Чацьвер 1, кастрычніка 1931
Цана нумара 5 кап.
БЕСЫ[illegible]ЛЫНА

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Петля фінансавага крызісу
ўсё мацней зацягваецца на шыі капіталізму
Хмара інфляцыі навісла над Эўропай

Чысёлая міна пры дрэннай гульні

ЛЁНДАН, 27 верасьня. (ТАСС). Большасьць буржуазных эканамістаў ацэньвае скасаваньне золатога стандарту, як «новую эру ў разьвіцьці капіталізму» і як найлепшы сродак да перамогі крызісу. Кейнс адзначае выгаднасьць скасаваньня золатога стандарту для краін, якія зьяўляюцца даўжнікамі Англіі, Аўстраліі, Індыі і Аргентыны.

Скасаваньне золатога стандарту, падумцы Кейнса, усьлед за Англіяй вправядзе таксама Канада, Італія, Скандынавія, Аўстралія і Паўднёвая Афрыка, магчыма і Нямеччына. Кейнс запуляе, што рашэньне Галяндыі захаваць золаты стандарт прыводзе ў канчатковым выніку да разбурэньня навучковай і цукровай прамысловасьці ў Галяндзкай Індыі. Па словах Кейнса пры сучасных умовах золаты стандарт зьяўляецца злом, якое можа перашкодзіць самым моцным краінам. Газеты аб становішчы Францыі і Амэрыкі Кейнс заўважае: «У выніку іх нежаданьня прымаць ва ўплату за вывезеныя тавары яніа-небудзь іншыя сродкі аплаты апрача золата, іх экспартны гандаль нямінуча будзе падаць». Кейнс заўважае далей, што «рашэньне, якое мы былі прымушаны прыняць, прыносіць нам безадкладнае паляпшэньне і пазбаўляе цяжкасьці на плячы іншых. Кейнс высоўвае аргумэнты супроць таможных мыт на тэй падставе, што падзеньне курсу фунта стэрлінгу на 25 проц. дае большыя выгоды з пункту гледжаньня пазбалічэньня экспарту і скарачэньня імпарту, чым павышэньне мыты на тыя-ж 25 проц.

Зьніжэньне фунта пя спыняецца

ЛЁНДАН, 29. Пасьля двух дзён працяглай устойлівасьці курс фунта стэрлінгу сёньня зноў пачынаўся. На сусьветных біржах кошт яго ў сярэднім роўны 15½ шылінгам. Настрой на лёндонскай біржы надаўлены. Курс дзяржаўных папер працягвае падаць. Курсы прамысловых акцый падымаюцца ў адпаведнасьці з падзеньнем курсу фунта. (ТАСС).

Усьлед за Англіяй--Скандынаўскі саюзастраў

СТАКГОЛЬМ, 29. Шведзкае тэлеграфнае агенцтва паведамляе: «Урад упаўнаважыў рэйхсбанк спыніць да канца пістапада абмен банкнот на золата, дазволіўшы адначасова рэйхсбанку адмаўляць гэты абмен раней, калі абалічнасьці будуць разьвівацца спрыяюча. Урад забараніў вывад золата з Швэцыі, за выключэньнем золата, якое належыць рэйхсбанку, або цэнтральным замежным банкам».

Шведзкі рэйхсбанк павысіў улікавую стаўку на 2 проц., г. зн. да 8 проц. (ТАСС).

ОСЛО, 27. Нарвежкае тэлеграфнае агенцтва паведамляе, што ў Нарвегіі таксама спасьцярегаецца залаты стандарт і ўводзіцца забарона на вывад золата за [illegible]. Адначасова ўзвышана стаўка на [illegible] да 8 проц. (ТАСС).

„Надзеі аказаліся дарэмнымі"

СТАКГОЛЬМ, 29. Шведзкае тэлеграфнае агенцтва паведамляе, што адміністрацыйная рада (праўленьне) шведзкага рэйхсбанку, якая ўхваліла скасаваньне золатога стандарту ўрадам, заявіла, што скасаваньне золатога стандарту ў Англіі мела свае рэзультаты надзвычайнае павышэньне попыту на золата і замежную валюту ў Швэцыі.

Надзеі атрымаць выстарчальныя замежныя крэдыты аказаліся дарэмнымі. Шведзкі міністар фінансаў падкрэсьліў, што фінансавая палітыка Швэцыі павінна надалей канцэнтравацца на задачы захаваньня пакупальнай здольнасьці шведзкай кроны ўнутры краіны, і выказаў надзею, што ўнутраная каштоўнасьць шведзкай кроны будзе таксама акрэсьліваць яе каштоўнасьць заграніцай. Шведзкі ўрад неадкладна прымае меры для паляпшэньня гандлёвага балянсу Швэцыі, які ў даны момант характарызуецца значнай перавагай імпарту над экспартам.

(ТАСС).

Закат „Крэйгера"

СТАКГОЛЬМ, 28. Перад скасаваньнем золатога стандарту ў Швэцыі адбылася нарада дырэктароў эмісійных банкаў Швэцыі, Даніі, Нарвэгіі і Фінляндыі.

Біржы ва ўсіх скандынаўскіх краінах працягваюць заставацца закрытымі і невядома, калі яны адкрыюцца.

У Швэцыі курсы каштоўных папер і акцый па-ранейшаму падаюць. Акцыі Крэйгераўскага канцэрну зноў катастрафічна зьнізіліся.

100 тыс. злотых--дзённая страта

ВАРШАВА, 30. Як паведамляе «Экспрэс Пораны» САЮЗ ВЕРХНЯ-СІЛЕСКІХ КАПАЛЬНЯ-ЎЛАДАРОЎ У КАТАВІЦАХ АЦЭНЬВАЕ СТРАТЫ ПОЛЬСКАЙ КАМЕННА-ВУГАЛЬНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ, у сувязі з падзеньнем курсу фунта стэрлінгу, У 100 ТЫС. ЗЛОТЫХ У ДЗЕНЬ.

„Росчаркам пяра--на эканамічнае рабства"

ЛЁНДАН, 29. Паводле паведамленьняў з Індыі, усеіндыйскі заканадаўчы сход большасьцю ў 64 галасы супроць 40 прыняў рэзалюцыі недавер'я апеляіндыйскаму ўраду.

Рэзалюцыя недавер'я выклікана пастановай брытанскага ўраду пастаўіць рупію (індыйскую валюту) у залежнасьць ад фунта стэрлінгу. Індыйскія члены заканадаўчага сходу ў сваіх выступленьнях падкрэсьлівалі, што «тактыка брытанскага ўраду зьяўляецца зьнішчэньнем індыйскай прамысловасьці, калі азалічнасьці будуць разьвівацца спрыяюча. Урад забараніў вывад золата з Швэцыі, за выключэньнем золата, якое належыць рэйхсбанку, або цэнтральным замежным банкам».

Англа-індыйскі ўрад праводзіць зараз жорсткія меры эканомі. Адрача скарачэньня заработнай платы дзяржаўным служачым, англа-індыйскі ўрад падрыхтоўвае правядзеньне раду новых падаткаў, павышэньне падаходнага падатку і ўвядзеньне новых імпортных мыт. Такім чынам бюджэт індыйскіх рабочых і служачых будзе ўрэзан адначасова з чатырох канцоў. Абвешчаньне вярхоўнага суду. (ТАСС).

Закрылася буйнейшая тэкстыльная фабрыка ў Польшчы

ВАРШАВА, 30. Закрылася буйнейшая Лодзінская тэкстыльная фабрыка Шэйблера і Громана з прычыны поўнай АДСУТНАСЬЦІ ЗАКАЗАЎ У ТКАЦКІМ ЦЭХУ. ЗВОЛЬНЕНА 1.000 РАБОЧЫХ.

Буравесьнікі ў Пэрсіі

ТЭГЕРАН, 27. З прычыны фінансавай катастрофы ў Англіі, попыт на ангельскі фунт стэрлінгаў спыніўся. Паводле паведамленьняў газет падзеньне фунту выклікала некаторае зьніжэньне цэн на імпартныя тавары, на пэрсідзкім рынку. Створана спэцыяльная камісія, якая займаецца вывучэньнем пытаньня аб зьмяншэньні афіцыйнага курсу пэрсідзкай валюты, які базіруецца на фунце стэрлінгаў.

Ліра хістаецца--тэндэнцыя ў ніз

РЫМ, 28. У біржавых колах перадаюць, што італьянскі ўрад прымушан траціць значныя сумы на падтрыманьне курсу ліры. За апошнія два дні курс ліры некалькі павысіўся, аднак, не дасягае ніяк нармальнага ўзроўню.

Курсы дзяржаўных пазык зноў зьнізіліся на некалькі пунктаў. (ТАСС).

На Вэнгерскім рынку катастрафічнае становішча

ВЕНА, 27. Як паведамляюць з Будапэшту, курс вэнгерскай валюты упаў з 20 верасьня на 25 проц. Вэнгерскія экспарцёры збожжа падарэлі вялізарныя страты ў рэзультаце падзеньня курсу фунта стэрлінгаў, бо значная частка экспартных зьдзелак была заключана ў фунтах.

Паводле заявы вэнгерскага ўраду, дэфіцыт дзяржаўнага ўраду Вэнгрыі складае 12 проц. усёй сумы бюджэту і роўны 150 млн. пэнге. Кароткатэрміновая дзяржаўная запазычанасьць Вэнгрыі роўна ўжо 420 млн. пэнге. Пакрыцьцё вэнгерскай валюты ўпала з 42 проц. у чэрвені да 27 проц. на 23 верасьня. (ТАСС).

ВЕНА, 27. Як паведамляюць з Бухарэсту, у Браілі адбылася канфэрэнцыя румынскіх экспарцёраў збожжа. На гэтай канфэрэнцыі было ўстаноўлена, што ў рэзультаце падзеньня курсу фунта стэрлінгаў румынскія экспарцёры збожжа страцілі ўжо ў сярэднім 25 проц. усёй сумы заключаных імі зьдзелак. (ТАСС).

Фігавы лісток „незалежнасьці" для прыкрыцьця анэксіі
Японскі імпэрыялізм „афарміляе" грабежніцтва

У пошуках прэм'ера--Марыёнэткі

ТОКІО, 30. «Народная канфэрэнцыя» ў Мукдэне рэарганізавала «асацыяцыю абмеркаваньня мер, неабходных для ўрэгуляваньня становішча» Старшынёй выбраны генэрал Гань-Чжао-Сі. Асацыяцыя апублікавала дэкларацыю, у якой гаварыцца, што яна створана выключна для падтрыманьня парадку і ня будзе ўмешвацца ў васныя справы». Прадпачэньня пошукі кандыдатаў ў старшыні новага «незалежнага» ўраду. Побач з Юань-Цзінь-Каем, Гань-Чжоў-Сі, Гань-Чжу-Хенем выказваецца ў якасьці кандыдатаў—былы кітайскі імпэратар, Ён-Сі-Шань і Сун-Чуан-Фан.

ТОКІО, 30. Паводле паведамленьня агенцтва ў Сінбу-Рэнто, усьлед за абвяшчэньнем незалежнасьці Гірыню, Хейлунцзян таксама абвясьціў «незалежнасьць». Па вестках з Харбіну, улады харбінскага асобнага раёну таксама абвясьцілі незалежнасьць і назначылі 30 новых камітэтаў для кіраваньня рознымі часткамі раёнаў.

„Незалежны" генэрал на японскім утрыманьні

ТОКІО, 30. Па вестках вашынгта міністэрства, генэрал Сі-Ся абвясьціў усіх начальнікаў паветаў Гірынскай правінцыі «імі сябрамі і прыступіў да арганізацыі пяхотнага палка, кавалерыйскага бальёна, артылерыйскага атраду і жандармэрыі. Сі-Ся зьвярнуўся ўчора да японскай улады з просьбай аб перадачым васных матар'ялаў, узятых пры забраеньні гірынскай арміі.

Японскія рабочыя выганяюць Фімэна

ТОКІО, 30. 13 буйных лева-цэнтрысцкіх рафарганізацый акругі Кандо (усходняя Японія) апублікавалі сумесную дэкларацыю, якая прапануе рэфармістуФімэну безадкладна пакінуць межы Японіі і спыніць «спробу ўкараненьня здрадніцкіх рэфармісцкіх ідэй у японскія рабочыя масы».

КОРАТКА

20-ты і апошні тыраж дзяржаўнай пазыкі 1926 году адбыўся ўчора 30-га верасьня ў Маскве. Разыграна [illegible] на бо[illegible] рублёў.

Радыёцэнтр СССР абвясьціў конкурс на лепшую [illegible] [illegible] станцыяў. Для прызначэньня [illegible] і [illegible], пабудаваных [illegible] станцыяў, выдаецца спэцыяльны фонд у суме 3.000 руб. Усяго будзе выдадзена 6 прэмій.

Новая электрастанцыя будуецца ў вобласьці Комі. Будаўніцтва намечана скончыць у студзені 1932 году. Магутнасьць станцыі 230 кілёват.

Забаставалі 156 рабочых паркалёва-набівной фабрыкі ў Кіото (Японія). Забастоўшчыкі наладзілі дэманстрацыю па вуліцах гораду. Паліцыя напала на дэманстрантаў і арыштавала 12 чалавек.

Сіамскія сяляне (ангельская калёнія), задушаныя глыбокім аграрным крызісам, адкрыта прадаюць сваіх дзяцей у явольніцтва. Продаж робіцца на гарадзкіх базарах.

Іваўская рабочая спартыўная [illegible] паведаміла Чэбоксары (Чувашія), [illegible] [illegible] гаспадар[illegible] чувашскім будаўніцтвам Чувашіі.

Італьянскі ўрад вымушан траціць значныя сумы на падтрыманьне курсу ліры. [illegible] верасьня на чорнай біржы ў Іванаполі доляр прадаваўся за 23 ліры. Курсы дзяржаўных пазык зноў зьнізіліся на некалькі фунтаў.

35 амэрыканскіх рабочых прыехалі з Нью-Ёрку ў Маскву ў пошуках работы.

Аўстрыйскі камуністычны саюз моладзі распушчан. Фармальная прычына для роспуску зьяўляецца, меўшы месца некалькі месяцаў таму назад дэманстрацыі камуністычнай моладзі супроць юга-славянскага і іншых пасольстваў.

„Левацкая" недаацэнка конскай цягі

Па Койданаўскім раёне на 20 верасьня плян сяўбы азімых выканан на 50,6 проц., аблёва — на 14,8 проц. у той час, як увесь плян сяўбы трэба было канчаткова выканаць да 23 верасьня.

Чым-жа тлумачацца прарывы? Чаму па Койданаўскім раёне, яе ёсьць моцная МТС, плян сяўбы сваячасова ня выконваецца? Зрашмела, што тут справа не ў «аб'ектыўных прычынах». Каренны прарыў ляжаць крыху глыбей. ЦО «Праўда» ў сваёй перадавой ад 21 верасьня піша: «У апошні час зрабіліся больш частымі паведамленьні аб правях «ляваццкай» недаацэнкі конскай цягі. У радзе калгасаў маюць месца спробы ўскласьці ўсё асеньнія работы на трактарны парк МТС, накідаючы коняй на выпасах». Вось гэтая «ляваццкая» недаацэнка конскай цягі і зьяўляецца галоўнай прычынай прарываў на сяўбе ў Койданаўскім раёне. Старшыні праўленьняў буйных калгасаў «Камінтэрн» і «Камунар» самі прызналіся, што, каб яны не чакалі, пакуль да іх у плянавым парадку прыйдуць трактары, каб яны адразу ўзяліся за'ска рыстаньне конскай цягі, дык сяўба была-б у іх калгасах даўно скончана. У гэтых калгасах цэлыя табуны коняй ходзяць па выпасах і не скарыстоўваюцца для працы.

Па вырэзу саміх калгасьнікаў «Коні ўжо адвыклі ад працы, стаці дзікімі, іх нельзя запрэгць у плавы».

З правядзі «ляваццкай» недаацэнкі конскай цягі неабходна навесьці самую рашучую барацьбу. Кожны калгас павінен памятаць, што нельга выключна на трактарны парк усклядаць усе работы па асеньняй сяўбе. Конь ні аднаго дня не павінен дарэмна гуляць. Абавязак кожнай МТС рацыянальна скарыстоўваць конскую цягу. Толькі пры такіх умовах мы дабіемся ў бліжэйшыя дні выкананьня плянаў сяўбы азімых.

В.

Магутныя дэманстрацыі на вуліцах Лёндану
супроць „нацыянальнай" эканоміі
2 ГАДЗІНЫ ПРАЦЯГВАЛАСЯ БАРАЦЬБА ЗА ПЛЯЦ

ЛЁНДАН, 30. Тут адбылася МАГУТНАЯ ДЭМАНСТРАЦЫЯ РАБОЧЫХ, дэманстраваўшых СУПРОЦЬ МЕР «ЭКАНОМІІ» НАЦЫЯНАЛЬНАГА ЎРАДУ. Калёны рабочых з усіх раёнаў Лёндану прыбылі ў Гайд-парк, дзе была выбрана дэпутацыя для таго, каб пайсьці ў парлямант і падаць мэмарандум, падпісаны 200 тыс. рабочых, узяўшы на сябе абавязацельства ўсімі мерамі рашуча супраціўляцца зьніжэньню дапамогі беспрацоўным. 20 ТЫС. РАБОЧЫХ ДЭМАНСТРАВАЛІ НА ВУЛІЦАХ, БЯГУЧЫХ ДА ПАРЛЯМАНТУ. НА ЧАЛЕ ІШЛІ КАЛЁНЫ РАБОЧЫХ БЯДНЕЙШЫХ КВАРТАЛАЎ ЛЁНДАНУ І ГРУПЫ ЎЗБРОЕНЫЯ ЦЯЖКІМІ ДУБІНКАМІ.

Уваход у парлямант ахоўваўся МОЦНЫМІ АТРАДАМІ ПАЛІЦЫІ. Адны, рабочым удалося ва многіх месцах ПРАРВАЦЬ ПАЛІЦЭЙСКІ КАРДОН І прабрацца на плошчу перад парлямантам. Гэтых рабочых атакавала скандуючая ад плошчы конная паліцыя.

Рабочыя ня ўступілі і некалькі разоў пераходзілі ў наступленьне, дабіваючыся захопу пляцу. Барацьба памяж паліцэйскімі і рабочымі працягвалася 2 ГАДЗІНЫ. ПАРАНЕНА МНОГА РАБОЧЫХ, АЛЕ І МНОГА ПАЛІЦЭЙСКІХ. За гэты час дэпутацыі ўдалося прабрацца ў парлямант, дзе мэмарандум беспрацоўных прыняло прыняць. Калі дэпутацыя выйшла з парляманту, рабочыя перабудавалі свае рады і рушыліся стройнымі калёнамі ў Гайд-парк, дзе дэманстрацыі працягваліся да 11 гадз. вечару. Пасьля гэтага рабочыя разьбіліся на калёны і арганізавана разышліся па сваіх раёнах са сьпяваньнем рэвалюцыйных песьняў і ў такім-жа бадзёрым настрої, як і ў пачатку дэманстрацыі.

Рабочыя настаўні арганізавана давялі дэманстрацыю, што ПАЛІЦЫІ УДАЛОСЯ АЧЫШТАВАЦЬ ТОЛЬКІ 9 РАБОЧЫХ.

Кандыдатура шахцёра--супроць кандыдатуры Мандальда
Напярэдадні выбараў ў ангельскі парлямант

ЛЁНДАН, 30. Усе партыі ліхаманкава рыхтуюцца да бліжэйшых выбараў у парлямант. Кансэрватары пастанавілі адмяніць прызначаную на 7 кастрычніка штогодную канфэрэнцыю партыі ў Бірмінгаме, каб не адцягнуць увагі партыі ад выбараў. Лейбарысты, наадварот, пастанавілі склікаць канфэрэнцыю ў Скарборо ў мэтах мабілізацыі партыі на выбарчую кампанію.

Мандальд будзе выступаць, як кандыдат нацыянальнага блёку. ЦК камуністычнай партыі пастанавіў выставіць кандыдатуру шахцёра супроць кандыдатуры Мандальда.

„Дэманстрацыя" надзвычайных дэкретаў

БЭРЛІН, 28. У рэзультаце учарайшых выбараў камуністычны ўрад Гамбургу, які да гэтага часу апіраўся на спрадвечныя партыі ад сацыял-дэмакратаў да народнай партыі, страціў большасьць галасоў, бо са 160 дэпутатаў парляманту, 87 належаць да апазыцыйных партый: камуністаў, нацыяналістаў і нацыянал-сацыялістаў. У зваязі з гэтым, у палітычных колах лічаць магчымым, што гамбургскі парлямант будзе ў хуткім часе распушчан і ўрад будзе створан шляхам надзвычайнага дэкрэту ўсяніцкага ўраду.

Хто-ж у курсе справы?

У Камарынскім раёне дазатуль не прапрацавалі і не прыступілі да рэалізацыі пастановы ЦК УсеКП(б) аб пачатковай і сярэдняй школе. 20 проц. школ яшчэ не пачалі заняткаў. Рамонт рэду школ не закончаны. Не хапае 15 пасьцяжнікаў. Падручнікамі і сьпіткамі школы мала забясьпечаны. Апалу ні ў адной школе няма. Раённспэктар асьветы пасхаў у адпачынак і школьным будаўніцтвам ніхто ня цікавіцца.

На пашыраным пленуме РВК палітінспэктар рабіў справаздачу, але ён адмовіўся даваць канкрэтныя весткі аб падрыхтоўцы да навучальнага году, матывуючы гэта тым, што «ня ў курсе справы».

Вельмі дрэнна стаіць справа з забясьпячэньнем настаўнікаў. Рэдакцыям працаўсьпы і органы снабжэньня не ідуць вярнуліся тварам да выкананьня пастановы Цэнтральнага Камітэту пагаў аб школе, і ў прыватнасьці аб паляпшэньні абслугоўваньня настаўніцтва.

Д. П.

У чырвоным Гамбургу
33.000 новых галасоў за Савецкую Нямеччыну
Катастрафічныя страты сацыял-фашыстаў

ГАМБУРГ, 28. Рэзультаты выбараў у Гамбургскі парлямант такіяы: кампартыя атрымала 169.000 галасоў, выйграўшы 33.000 галасоў у параўнаньні з выбарамі ў рэйхстаг у 1930 г. і 54.000 галасоў у параўнаньні з выбарамі ў Гамбургскі парлямант у лютым 1928 году. Сацыял-дэмакраты атрымалі 215.000 галасоў, страціўшы адзіаццаць 22.000 і 33.000 галасоў. Нацыянал-сацыялісты (фашысты) атрымалі 202,455 галасоў, выйграўшы 58.000.

На гэты раз ня быў выстаўлены спіс кансэрватыўна-народнай партыі, які пры выбарах у рэйхстаг у 1930 годзе атрымаў 26.000 галасоў. Гэта вакзі для таго, каб улічыць сабе ў сапраўдным сьвятле рост ліку галасоў нацыянал-сацыялістаў.

Усе буржуазныя партыі цэнтру і дробна-буржуазныя партыі страцілі разам 63.200 галасоў, а ўключыўшы сюды страты сацыял-дэмакратыі атрымліваецца, што ўсе буржуазныя партыі страцілі 89.700 галасоў. З буржуазных партый выйграці толькі 2 партыі — нацыянал-сацыялісты і нямецкая дзяржаўная партыя, атрымаўшы рост галасоў у 72.000.

Такім чынам, у канчатковым выніку буржуазныя партыі на выборах страцілі 17.100 галасоў, у той час, як кампартыя выйграла 33.400 галасоў.

Гэтыя рэзультаты гаворацъ о новым сур'ёзным посьпеху германскай кампартыі ў справе заваланьня большасьці рабочае клясы. Раней о.-д. мелі на 100.000 галасоў больш кампартыі, а цяпер толькі на 45.000. Кампартыя завадзала на свой бок лепшых рабочых з эсэрадзіцчы с.-д.

С.-д. нацыяналі сур'ёзнае паражэньне. Гэта вымушана прызнаць іх мясцовая газета «Гамбургер Эхе», гаворачы: «Зноў выбары прынесьлі катастрафічныя страты, якія тлумачацца жудасным распадам эканамічных і палітычных сацыяльных эсноў».

Нацыянал-сацыялісты выйгралі галасы старых буржуазных партый, якія разваліваюцца. Так, народная партыя згубіла 23.000 галасоў, гаспадарчая партыя — 6.000 галасоў і г. д. Буржуазія канцэнтруе сілы вакол партыі адкрытага фашызму.

У рабочых раёнах кампартыя ідзе на першым месцы. Так, у Нэйштадце (чырвоная цытадэля Гамбургу), кампартыя сабрала 15.200 галасоў — столькі-ж, колькі с.-д. і нацыяналісты разам.

Выборы ў Гамбургу сказалі, што абодны клясавыя лягеры канцэнтруюць свае сілы. Орган кампартыі «Гамбургер Фольксцайтунг» у перадавым артыкуле ўказала, што выборы паказалі падрыхтаванае абвастрэньне клясавых супярэчнасцяй і тымчасовае тымпаў нарастаньня рэвалюцыйнага крызісу.

6 раёнаў прэміюцца за сваячасовую ўборку, абмалот і расьціленьну
Пастанова калегій Наркамзему і Калгасцэнтру БССР

За сваячасовую ўборку (цярабленьне), абмалот, расьціленьне і мачку ільну, праведзеную Лёзьнянскім, Сурасіцкім, Гарадецкім, Сенежскім, Лепельскім і Шклоўскім раёнамі, на аснове правільнага арганізаванага кіраўніцтва калгасамі, калегіі НКЗ і праўленьне Калгасцэнтру БССР пастанаўляюць:

Выдаць у распараджэньне раёна і калгасгасоў нізэйшаказаных раёнаў у якасьці прэміі 5.750 руб. і на 40.000 руб. прамтавараў для прэміяваньня калгасаў і калгаснікаў грашыма і прамтавараў за лепшую арганізацыю працы ў часе ўборкі ільну і забясьпячэньня гэтых калгасаў прамтаварамі (тавэвае адзеньня). Сродкі і прамтавары наступным парадкам:

Лёзьнянскаму раёну грашыма 1.000 руб. і прамтавараў на 6.000 руб.

Сурасіцкаму раёну грашыма 750 руб. і прамтавараў на 6.000 уб.

Гарадецкаму раёну грашыма 1.500 руб. і прамтавараў на 9.000 руб.

Сенежскаму раёну грашыма 750 руб. і прамтавараў на 8.000 руб.

Лепельскаму раёну грашыма 750 руб. і прамтавараў на 8.000 руб.

Шклоўскаму раёну грашыма 1.000 руб.

Нармамзем і Калгасцэнтр упаўнаважаны, што раённыя арганізацыі і калгасы гэтых раёнаў яшчэ з большай энэргіяй, па-бальшавіцку арганізуюць работу іх апрацоўцы і дагэрміновай здачы (продажы) ільнавалакна і пянькі.

Наркамзямляробства БССР
РАЧЫЦКІ.
Старшыня Калгасцэнтру БССР
МІЦЬКОЎ.

Паведамленьні

— Усім гаркомам і райкомам КП(б)Б. Прапануецца не позьней 5 кастрычніка 1931 г. даслаць у ЦК КП(б)Б стат. весткі аб росьце партый ў 3-м квартале і становішчы партарганізацый на 1-X—31 г. па ф.ф. №№ 2, 2-а, 3-а і 6.

Правілы прыёму ва ўсебеларускую саўпартшколу II ступені імя т. Молатава ў Віцебску на 1932 г. (зімовы набор)

1. Усебеларуская саўпартшкола складаецца з 2-х аддзяленьняў, з якіх адно рыхтуе працаўнікоў калгасаў ільнаводных раёнаў (патрабуючкаў і палітасьветных работнікаў), другое — прапагандыстаў тэкстыльнай прамысловасьці і ільнаводных раёнаў.

2. На калгаснае аддзяленьне прымаюцца рабочыя і калгаснікі партыйцы са стажам ня менш 2-х год і члены ЛКСМ з вытворчым рабочым, батрацкім стажам, або вытворчай работы ў калгасе ня менш 3 гд і камсамольскім стажам ня менш 4-х год.

Увага: Лік прынятых камсамольцаў (ня членаў партыі) складае ня больш 20 проц. агульнага ліку прынятых.

3. На прапагандыцкае аддзяленьне прымаюцца рабочыя і калгаснікі выключна члены партыі з 2-хгадовым партстажам і члены ЛКСМ з 3-хгадовым камсамольным стажам, пры палітчы адзнаго гадовага партстажу.

Увага: Ад т.т., паступаючых ва Усебеларускую партшколу, патрабуецца 2-гадовы стаж практычнай грамадзкай работы, пры чым на прапагандыцкае аддзяленьне ў першую чаргу прымаюцца, якія маюць стаж прапагандыцкай работы.

4. Паступаючыя ў саўпартшколу павінны ўмець добра чытаць і пісаць на бельмове эмаховіць галоўную думку і выкладзіць не пісьмова, добра ведаць 4 дзеянні арыфметыкі ніц цялым лікамі, арыентавацца ў бягучай палітычнай сацыяльнай уладзы, ведаць асновы гісторыі партыі.

5. Адбор у саўпартшколу праводзіцца культкомісіямі гаркому і райкому КП(б)В і павінен быць скончан да 15 лістапада 1931 г., а матэрыялы зарэгістраваны павінны быць даасланы ў саўпартшколу.

6. Накарэнцам, выдзеленым гаркомам і райкомам КП(б)В для паступленьня ў саўпартшколу і якія прайшлі мандатную камісію пры СНП, дасадзе месячны адпачынак (з захаваньнем пенсіі, згодна пастановы Наркампрацы) для прахадзеньня падрыхтоўкі, якая праходзіць пад кіраўніцтвам культпрогу гаркому і райкому.

Увага. Асобы, якія не атрымалі адпачынак, атрымліваюць выходную дапамогу за 1 месяц грашыма.

7. Прыёмныя іспыты ўтвараюцца з 20 па 25 сьнежня 1931 г., пры саўпартшколе камісіяй з прадстаўнікоў гаркому партыі, гаркому ЛКСМ і загадчыка школы. Заняткі пачынаюцца з 1 студзеня 1932 году.

8. У саўпартшколу педанушчаюцца хворыя заразнымі хваробамі, у тым ліку вэнэрычнымі, туберкулёзам, неўрастэніяй у цяжкай форме. Інваліднасьць ня можа служыць перашкодай да паступленьня ў школу, калі яна не перашкаджае разумовай працы.

9. Камандыраваньні ў саўпартшколу забясьпечваюцца мясцовымі арганізацыямі сродкамі на праезд у абодны канцы і сродкамі харчаваньня ня менш, як на 5 дзён.

10. Камандыроўка мясцовых арганізацый не гарантуе прыём у школу, ня прынятыя варочаюцца назад, за імі захоўваецца займеная раней пасада.

11. Школа прадастаўляе слухачам інтэрнат, пасьцельныя прылады, харчаваньне, патрэбныя падручнікі і стыпендыю. Сямейныя дадаткова абрымліваюць сямейную стыпендыю ў залежнасьці ад ліку ўтрымальцаў і іх матар'яльнага забясьпячэньня. Школа не забясьпечвае кватэрамі сем'яў слухачоў.

12. Камандыраваныя ў школу павінны прадставіць наступныя дакументы:

а) камандыроўку ад гаркому, або райкому;

б) характарыстыку аб працы, выданую адпаведнай арганізацыямі;

в) дакумант аб узросьце і стане здароўя;

г) дакумант аб адносінах да вайсковай службы;

дзасьведчальную анкету для паступленьня ў школу;

е) пасьпіску аб тым, што правілы паступленьня ў школу яму вядомы.

13. Агульны кантынгент зімовага набору устанавіць у колькасьці 150 асоб, з якіх 70 на прапагандыцкае аддзяленьне.

Размеркаваньне месц па гаркомах і райкомах устанавіць наступнае:

Назва гаркому і райкому	Агульная колькасьць	З іх прыняты даступ
1. Віцебскі гарком	70	30
2. Гарадоцкі райком	15	7
3. Лёзьненскі	15	7
4. Полацкі	20	10
5. Сяроцінскі	7	3
6. Бешанковіцкі	7	3
7. Сенненскі	7	4
8. Суражскі	7	3
9. Чашніцкі	10	5
10. Бушацкі	5	2
11. Лепельскі	8	4
12. Асьвейскі	5	2
13. Расонскі	4	2
14. Дубровенскі	7	3
15. Мсьціслаўскі	7	3
16. Дрысенскі	7	3

Заг. Культпрогу ЦК КП(б)Б
ЧАРНУШЭВІЧ.
Старшыня арг. камісіі
ПРУДНІКАЎ.

Паправка

Пачатак паведамленьня ТАСС аб заканчэньні гандлёўкі палітзьняволеных у польскіх турмах, зьмешчанага ў апазнім нумары «Зьвязды» ад 30 верасьня, трэба чытаць: «На працягу трох дзён, пачынаючы ад 26 па 22 верасьня і г. д.»

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

„ЧЫРВ. ЗОРКА" Пач. 7; 8-45; 10-30 — Пачала гукавы мастацкі фільм Пуцёўка ў жыцьцё драма ў 94 эпізодах.
„КУЛЬТУРА" Пач. 7, 8-45, 10-30 — Новы мастацкі фільм РАЗГРОМ
ПРАЛЕТАРЫ Адкр. з 12 г. дня. — Толькі 3 дні: 29, 30, 1-X. Мастацкі фільм: БАНДА ЗЛЫХ КНЯЗЯ. Зьвыш праграмы Сяброўка № 48
„Юны Ленінец" (Будынак кіно „Культура") — Мастацкі фільм ДНЫМІ ХІТЛЕ у 8 частках. Зьвыш праграмы—хроніка. Пач. у 1 г. Каса—з 11 г.
„СПАРТАК" Пач. 7, 9 і 11 г. Каса адкрыта з 5 г. — З 1-га кастрычніка—баявік РЭЙНСКІ БУНТАР драма ў 7 частках.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"
АДКРЫТА з 12 гадз. дня — З чацьвяргу, 1 кастрычніка
БУНТ БАБУЛЕК
Арыгінальная кавэдыя.
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ ХРОНІКА № 31
Пачатак дзённых сэансаў у 2 гадз. і 3-30.
Пачатак вечэрніх сэансаў у 6-30, 8, 9-20 і 10-40.
Каса адкрыта з 12 гадз. дня.
На дзённы сэанс цэны зьніжаны.

БЕЛДЗЯРЖСНАБСБЫТУ ПАТРЭБЕН на сталую працу ЮРЫСКОНСУЛЬТ.
Адрас: Белдзяржснабсбыт, Дом Камунбанку, Ленінская, 36, тэлефон № 4-53.

МЯНЮ кватэру з 3-х пакояў і кухні з выгодамі (вул. Урыцкага, 3-4) на 3 пакоі бальшых, ці на 4 пакоі.

БЕЛДЗЯРЖКІНО ПАТРЭБНЫ на сталую работу ў Менску ў Праўленьні трэсту:
Адзін старшы бухгальтар
Адзін бухгальтар
Адзін пам. бухгальтара
Аплата па згодзе.
Адрас: Савецкая 90, другі паверх.

БЕЛМАНТОРА „БЕЛЭМІЗА" — (БЕЛЭМІЗА) — для размяшчэньня запрошаных спэцыялістаў
КУПЛЯЕ І НАЙМАЕ НЕАТРЫ, ПАКОІ АБО ДАМЫ ў г. Менску і прыгарадах.
З прапановамі зварачацца па адрасу: плян Воліна № 7, Белмабел, Беларускі інстытут гаспадарчы Сектар дам т. ВОЛКАВА. БЕЛЭМІЗА.

Гарпрафсавет, дча і Гарсавет асобняхіму сёньня, 1 кастрычніка, у 7 гадз. веч. у памяшк. цырку ПРАВОДЗЯЦЬ вечар спайкі Чырвонай арміі з рабочымі калектывамі г. Менску.
На вечары будуць заслуханы даклады аб выніках мануўраў Чырвонай арміі і рапорты прадпрыемстваў аб выніках мануўраў СПА і вытворчых мануўраў па выкананьні прамфінпляну 3-га кварталу 3-га рашаючага году пяцігодкі.
Адначасова будуць падведзены вынікі працы цырку за летні сэзон.
У канцы вечару адбудзецца паўтэхоўка артыстаў цырку.

Беларускі геалёга-разьведачны трэст „БЕЛГЕАЛРАЗЬВЕДКА" ЗАПРАШАЕ
асоб сканчэньня Бел. сельска-гаспадарчую акадэмію і [illegible] аддзяленьне ВДУ для пасылкі [illegible] і Маскоўскі геалёгаразьведачны інстытуты
для пагрыжэньня [illegible] на спэцыяльнасьцях інжынэраў-[illegible], геалёгаў-шукальнікаў, інжынэраў-разьведчыкаў, гідрагеолёгаў, геафізыкаў, а таксама для пасылкі ў Акадэмію Навук СССР на спэцыяльнасьцях сапрэфітэлёгаў.
Заявы накіроўваць у сэктар кадраў Белгеалразьведкі, Менск, плян Воліна, 21-1, ВСНГ БССР.

Сьмілавіцкі новаадкрываемы с.-г. тэхнікум буйной рагатай жывёлы і малочнай прамысловасьці
абвяшчае прыём на 1-шы курс.
Тэрмін навучаньня 2 з поўгады
Прымаюцца асобы, скончыўшыя 7-годку або маючыя падрыхтоўку ў абхваце 7-годкі. Могуць быць прынятыя асобы з вядамі нізкай 7-годкі, якія маюць практычны вопыт работы на жывёлагадоўлі і веды ў абсяге ня менш 6 груп.
Заявы накіраваць: м.